# Кастусь Цвірка

# Такія сэрцы у нас

ВЕРШЫ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя мастацкай літаратуры
МІНСК 1959

Кастусь Цвірка нарадзіўся ў 1934 годзе ў вёсцы Зялёная Дуброва, Старадарожскага раёна, Мінскай вобласці. У 1953 годзе скончыў сярэднюю школу і паступіў на філалагічны факультэт Беларускага Дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна.

У студэнцкія гады К. Цвірка актыўна выступае на старонках рэспубліканскага друку. Вершы яго змяшчаліся ў часопісах «Полымя», «Беларусь», «Маладосць», у рэспубліканскіх газетах.

З 1958 года К. Цвірка працуе выкладчыкам мовы і літаратуры на Случчыне.

«Такія сэрцы ў нас» — першы зборнік маладога паэта.

## ТАКІЯ СЭРЦЫ Ў НАС

Такія, мусіць, косці ў нас —
Нам у пуху не спіцца,
Такія, мусіць, ногі ў нас —
Нідзе нам не сядзіцца,
Такія, мусіць, рукі ў нас —
Ніяк ім не стаміцца.

Ім трэба муляцца, касцям,
У цягніку на дошках,
Ім трэба пыльны стэп, нагам,
Змяраць ушыр і ўдоўжкі,
Ім трэба лёд прабіць, рукам,
Скалу здрабіць на крошкі.

Хай проста ў вочы дождж і гром
Не змусіш нас згінацца,
Хай раптам цела зморыць сном
Не будзем мы хістацца,
Хай заінее нават лом —
Мы не расшчэпім пальцаў.

Такія, мусіць, рукі ў нас,
Такія, мусіць, ногі ў нас,
Такія, мусіць, косці ў нас...
Такія сэрцы ў нас!
1957

# *К а з а х с т а н с к і ж н і в е н ь*

## ЮНАЦТВА Ў ДАРОЗЕ

Зноў — паравозныя гудкі...
Зноў — гулкі колаў ляскат...
Трывожыць вецер трапяткі,
Палынны, кустанайскі.

Мы ў стэп злятаемся, сыны
Тых юнакоў геройскіх,
Што абчасалі валуны
Ў падмурак Камсамольска.

А нас таксама ж не на пляж
Сабралі дома маткі.
Сустрэнуць палявы шалаш
Ды белыя палаткі.

Мы сцерпім мужна, як яны,
І дождж, і завіруху.
Для іх мы па крыві — сыны,
Але браты — па духу!
1958

## ПРАЯЗДЖАЮЧЫ УРАЛ

А вось і ён, Урал з красою дзікай,
Знаёмы мне ўсяго са школьных карт.
Відаць здалёк — крутых вяршыняў пікі
Праткнулі белы пух залётных хмар.

І нас не адцягнуць ад шыб вагонных:
Дай хоць зірнуць, як за гудкамі ўслед
Па схілах гор збягаюць на адхоны
Асілкі-кедры, засланіўшы свет.

А паміж скал, з-за чаратоў зялёных
І валуноў у засені лясной,
Іскрыцца возера крышталь гранёны —
Аж рэжа вочы яснай сінявой.

Зноў пад цягнік ляцяць маеты і дамбы,
Гарбатыя ляцяць паўз нас хрыбты.
Сябры-аматары, залезшы ў тамбур,
Старанна ловяць іх у аб'ектыў!

Імчымся мы, і не адвесці вока
Ад сініх гор — нідзе такіх няма.
Эх, а калісьці вучнем на уроку
Я па Уралу двойку атрымаў.
1956

## ПАЛАТКА

Мы ведалі: не будзе тут і блізка
Такога інтэрната, як у Мінску.
На голым месцы расхінулі скатку,
І сярод стзпу — вырасла палатка.
Хай барабапіць лівень па брызенту,
Мы нібы ў інтэрнаце зноў, студэнты.
Няхай няма у ім шырокіх вокан,
Ды люк адчыніш — баяна ўсё навокал,
Хай замест ложкаў нікельных — бароны,
А пасля працы спім тут, што бароны!
Калі ж — бывае! —ў чамаданах пуста
І на палатку — хлеба пара лустаў,
Дык гэты хлеб нажамі мы бясслоўна
На трыццаць два раты надзелім роўна,
А вечарам, забыўшыся аб скрусе,
Пяём брыгадай, як ляцелі гусі...
Хай стэп кругом, а ўсё ж скажы мне, браце
Ці ж мы не у сапраўдным інтэрнаце?
1957

## ЭКЗАМЕНЫ

Сядзеш з кнігай — весела не весела,—
Не звядзеш і воч, пакуль зара.
Хто не знае, што ў студэптаў сесія —
Самая гарачая пара!

Тут жа спаць няма калі таксама нам:
Стэп не можа золата ўтрымаць.
Самыя цяжэйшыя экзамены
Сёння нам даводзіцца здаваць.

Не між сцен, дзе свет быў убаку з-за іх:
Наша аўдыторыя — ўвесь стэп;
І не за сталом, а проста ў кузаве,—
Дзе ўпраўляйся толькі звозіць хлеб!

Хай у нас няма экзаменатара —
За яго радзіма тут сама.
І таму гуляць мы не аматары:
Стань і рук з ланаты не здымай.

Нам сабраць бы ураджаі слаўныя!
Дык дармо, што плечы ўжо баляць.
Тут у нас экзамены дзяржаўныя,
Іх нам трэба вытрымаць па пяць!
1957

## ЗОЛАТА ДЖЭТЫГАРЫ

За Джэтыгарою стэп бясконцы.
Кажуць, тут — аж пот з рабочых ліў
Некалі з Расіі прамыслоўцы
Здабывалі золата ў зямлі.

І стаіць, як сведка, ля Табола
Порамытага пяску гара.
Сёшія мы з пуцёўкай камсамола
Да цябе прышлі, Джэтыгара!

Шчэ не ўсё тут вычарпана з ілу,
Многа тут дабра яшчэ ляжыць.
Вунь пшаніца ў стэпе урадзіла:
Колас к коласу — зямля звіпіць!

Трэба нам усё сабраць, да зерня.
А характар жа у нас круты:
Зрапку столькі збожжа перавернем,
Што да сонца ўзнімуцца бурты.

Як здалёк нрыедзе джэтыгорац
І дадому пойдзе праз палі,—
Ён убачыць нечакана горы,
Скажа: — Зноў тут золата знайшлі!
1957

## РУКІ

Хлеб цалінны! Бы стэп затапіла...
Камбайнеру не сніцца прывал.
Рукі ў ведді блакітных пражылак
Без спачыну сціскаюць штурвал.

Да крыві хай натруцца далоні,
Ды, як сэрца, матор будзе біць..
Вось на гэтыя рукі сягоння
Свет увесь з захапленнем глядзіць
1957

## ЯК ГАРТАВАЛАСЯ СТАЛЬ

Самі прышлі сюды — гэткі характар наш.
Скрозь — ні хаціны. Наш дом,— дзе ступіў,
Спальня —кабіна няўтульная трактара:
У абаранак скруціўся — і спі!

Дождж ледзь пральецца, і ўжо бездарожжа тут:
Гразь — не раўня лунінецкай гразі.
Сонца падсушыцъ — зноў б'ешся, зняможаны,
А цаліна — хоць зубамі грызі!

Білі пяскі нас шалёнымі хвалямі,
Выла вятрамі стэповая даль.
Тут вось, у свісце віхур, пазнавалі мы,
Як гартавалася сталь.
1957

## ТАРПАН

На міг узнік перад буртом.
Не ўспелі й глянуць зблізку
Па току тупнуў капытом,
І толькі ўгору пырскі!

Глядзелі доўга наўздагон,
Як бег ён полем пыльным.
Не разумеў, напэўна, ён,
Што ўзняты стэп кавыльны.

Прасторы дзікія са сну
Грымяць: па кроку кожным
Спаткнецца ён аб баразну,
Абколе ноздры пожняй.

І так гайсае без дарог
Над тым жа, родным небам,
Хаця і вырвалі з-пад ног
Яго
плугамі глебу...
1957

## ДВОЕ Ў СТЭПЕ

Ім сцежак тут не трэба:
Шырокі стэп — гуляй.
Над імі — ў зорах неба,
Наўкол — маўчыць зямля.

Іх Мінск за белым светам,
Ды добра тут адным.
Ледзь цягне цёплым ветрам
З начное цаліны.

Бы ў сне, паціху крочаць,
І кожнаму відаць,
Як дарагія вочы,
Што светлякі, гарацць.

Даўно палатка знікла:
Дзе, у якім баку?
Хлапед рукой нязвыкла
Бярэ яе руку.

Бядзе іх вечны клопат,
Дармо, што згублен стан
У тым баку — Еўропа,
Там — Ціхі акіян!
1957

## У ГАСЦЯХ У КАЗАХА

Сядзеў я ў старога казаха,
І той за стадом, як пра цуд,
Расказваў і кляўся алахам,
Што бачыў ён Леніна тут:
Нібы, уцякаючы з ссылкі,
Ён рана аулам прайшоў
І доўга стаяў на развілках
Старых палыновых шляхоў...

Я слухаў за кубкам кумыса,
А з рамкі на светлай сцяне,
Знаёмы мне кожнаю рысай,
Глядзеў правадыр на мяне.
На століку чыстым прыкмеціў
Я горачку кніг і папер —
Відаць, яшчэ вучацца дзеці
І, пэўна, у школе цяпер...

А тут абажур каляровы
Над лямпачкаю Ільіча,
Прыёмнік на покуце новы
Стаіць на агні кумача.
І нумар сталічнае «Праўды»,
Любоўна пакладзены ў кут.
Упэунены я: гэта праўда,
Што Ленін праходзіў і тут.
1957

## ХЛЕБ

Я толькі-толькі з Казахстана,
Спыніць, не знаю, позірк дзе б:
На ўсіх прылаўках ён, духмяны,
З пякарань мінскіх свежы хлеб!
Стаю, гляджу, і дзіўна неяк,
Як проста ўсё, каля латка:
Дастаў руб сорак сем капеек,
І бохан цёплы — у руках!

А мне на памяць раптам прыдзе
Нядаўні неспакойны лёс
Ці ж не за гэтым хлебам тыдзень
Мяне на нарах поезд трос?
Не праз яго ж у стэпе хіба
Каля Табола, у разліў,
Дзень да цэнтральнае сядзібы
Я гразь вясновую мясіў?

А на таку ў гарачым жніўні,
Калі ударыў дождж густы,
Садраўшы з плеч плашчы, ад ліўня
Укрылі цёплыя бурты.
І краўся здрадны сон пад вейкі,
Як мёрз я ў посвісце завей-
Мой хлеб каштуе не капейкі,
О не! Ён значна даражэй!
1957

## НАША МАЛАДОСЦЬ

Ён толькі ў сон нам урываўся гулам,
Цалінны стэп, што слаўся убаку.
Але эпоха нас не абмінула:
Яна дала і нам па рукзаку.

І рады я, што з аўдыторый вузкіх,
Пранёсшы праз спякотны небасхіл,
Нас, чысценькіх студэнцікаў бязвусых,
Яна закінула ў гарачы пыл.

Я рад, што нас не песцілі і блізка,
Што па каўдобінах удосталь там
Нас калыхала, быццам бы ў калысках,
Кідаючы з барта і да барта.

Я рад, што мы, сціскаючы рыдлёўкі,
Варочалі бурты па дню, па два,
А ведер ледзяпы і праз ватоўкі
Нам аж да самых костак даставаў.

Але ў адчаі з нас ніхто не падаў:
Стаялі мы — усім вятрам на злосць.
Я ведаю: заўсёды будзем рады,
Што ў нас была такая маладосць!
1957

## *Р э х а*

* * *
Іду зямлёй я, сонцу рад,
І мне чуваць здалёку
І спеў сяброў каля Дрысвят,
І Дпепрагэса рокат,

І на пшанічнай цаліне
Матора ўпарты лёскат,
І там, дзе чахнуў сяланец.
Гаючых мораў плёскат,

І аж з-пад зорак мне чуцён
«Біп-біп» — планеты ўцеха,
І казачны ракеты звон,—
То ўсё «Аўроры» рэха!
1958

**РАНІЦА**

Зямля — аркестр. Ты да зары
Ідзі ў прастор, і скрозь
Пачуеш, як ледзь-ледзь вятры
Спрабуюць струны лоз.

І вось пад воблакі з раллі
Жаўрук занёс званок,
Затым ад горада ў палі
Здалёк гукнуў гудок.

За ім — другі, а там — ізноў,
І ўжо — чуваць здаля —
У горны дымных камінoў
Іграе ўся зямля!
1956

## ВЁСКА МАЯ

Вышаў з горада. Горды,
Стаў на ўскраіне я:
Недалёка ад горада
Веска мая!

Як зірну з-пад далоні я,
Бачны мне між кляноў
Нават дахі чырвоныя
Нашых новых дамоў.

А як вечар насунецца,
Лягуць цені на дол,
Бачу й родную вуліцу
У агнях навакол!

Нават чутна, як радыё
Між зялёнай ліствы
Лье і лье над прысадамі
Песні з Мінска й Масквы

Ды як з Дома культуры
Праз акно ў паплапы
Вальс «На сопках Манчжурыі»
Распляскаў духавы.

Аж разносіцца молада
Хваляй рэха ў гаях...
Недалёка ад горада
Вёска мая!
1955

## ВЯСНА Ў ДУБРОВЕ

Тут нядаўна мёрзлым голлем
Грушы краталі блакіт,
Ды зіму, нарэшце, з поля
Змылі, знеслі раўчукі.

Сонца сад без перадышкі
Абдае ўвесь дзень цяплом,
Аж успыхнулі пупышкі
Белым-белым аганьком.

Паглядзіш — зямля ў абнове,
Пасвятлела старана.
Па маёй ідзе Дуброве
У белым полымі вясна!
1955

## ХЛАПЧУКІ

У дні канікул, летняю парою,
Я падружыўся з плоймай хлапчукоў.
І да цямна дзе-небудзь каля хвоі
Я слухаў бы маленькіх дружбакоў.

Аб тым, як з грушы Ўладзіха аднойчы
Спарола мігам Цішку ў баразну,
Як на начлезе Петрык зябкай ноччу
Каля агню спаліў калашыну...

Яны у лес мяне цягнулі часта,
Каб ім я вожыка прынёс у дом
Ці паказаў на клёніку купчастым
З рабенькімі яечкамі гняздо.

А як ішоў між імі, ўсе заўзята
На цыпачкі, стараліся прыўстаць,
І крыўдна, бачыў я, было рабятам,
Што й да плячэй мне не маглі дастаць.

Абмацвалі ўсё мускулы тугія
І крок свой параўноўвалі з маім.
Мне хлапчукі зайздросцілі малыя
А я... зайздросціў ім.
1956

## У МУЗЕІ ЯНКІ КУПАЛЫ

Ледзь крануўся я клямкі дзвярэй,
І рука задрыжала,
Нібы гэта зусім не музей,
А кватэра Купалы.

Сёння там, дзе сцяжынкі паўз сад
Праляглі на прадвесні,
Слухаў шчасна ў натоўпе дзяўчат
Я Купалаву песню.

І хоць тут не сустрэўся я з ім,
Знаю: з родным народам
Ён па краю ідзе дарагім,
Малады, як заўсёды.

Толькі ж што гэта вунь у кутку
Падыходжу, трывожны.
Бачу шапку яго на цвіку,
Плашч, кіёчак дарожны.

Заспакоіўся, знаю: ён жыў!
Гэта рэчы ў знямозе
Ён сюды, у куток, палажыў,
Сам жа — зноў у дарозе!
1956

## МЯЦЕЛІЦА

Гляджу, гляджу за вокны,
Дзіўлюся, цёмны дзеяь які:
Мяце зіма садок наш
У сотні белых венікаў.

Хапаючы за вещче,
Нахабны і раз'юшаны,
Зноў здзекуецца вецер
Там са старое грушы...

А тут, у хаце, грубка —
Ажно гудзе, нагрэтая.
Сядзі ды чай пі з кубка
Да самага да лета...

А я зрываю шалік
Шырокі мой на вешалцы,
А я іду над хвалі
Вясёлай куралесіцы.

Няхай жа твар халодзіцца,
Няхай ж а шчокі студзяцца,
Хай сэрца з ветрам водзіцца
Няхай са сцюжай дружыцца
1958

* * *

Вецер гойсае яра
Ў сумным лесе нарожнім.
Пад кудлсляю хм арак
Разаслаліся пожні,

Што ж, хадзі цяпер з Лыска
Мадай сумку пустую.
Блізка поч ці не блізка,
А цябе й не турбуе.

Рві мятлюк без карысці,
Кроч ляском без турботы.
Толькі слухай, як лісде
Ледзь шапоча пад ботам.

Тут — найлепш за курорты:
Дыхай, дыхай жывіцай.
Так і просяцца ў рот твой
Сакаўныя брусніды.

А нагнешся, з-пад носа —
Фырр! Глушцы — і не злічыш.
Калі знікнуць між сосен,
Скочыш: ты ж паляўнічы!
1958

**ЛЕСАВЫ ХМЕЛЬ**

Уся у карэннях сцежка:
Не пазбіваць бы хоць ног.
Вось першая сыраежка
Легла у кошык, на дно.

І ўжо ты па ценях рабых
Блукаеш паміж камлёў,
Находзішся так, што, мабыць,
Да хаты б і ног не даплёў.

Ды стому сваю кладзеш ты
У пярыну мяккую — ў мох,
І цела самлела дарэшты:
Не чутна ні рук, ні ног.

Высокая елка толькі
Недзе шуміць ля хмар,
Цярушачы ціха іголкі
На шыю тваю, на твар.

Расы на траве — ні кроплі,
І, мусіць, ад раніцы тут
Стаіць над верасам цёплым
Бясконцы пчаліны гуд.

Так легка у смольных хвойках,
І ты на ўсе грудзі свае
З імхоў і брусніц настойку,
Нагрэтую сонцам, п'еш.

А ўстанеш з зялёнай пасцелі,
Ідзеш — трава не трава.
Ад лесавога хмелю
Кружыцца галава.
1957

## ЖУРАВЫ

У хмарках, далёка ад нівы,
Гурт жураваоў растае:
Куды вы, куды вы, куды вы,
Шэрыя птахі мае?

Пад вамі, ўся ў лиеді апаўшым,
Хутка зямля плыве
З затокай, дзе гнёзды вашы
Стынуць у цёмыай траве.

Дзе ўсё, да апошняй сцяблінкі,
Знаёмае ў гэтым краі...
Цяпер тут дажджы безупыпку
Скачуць па шэрым куп'і.

А там, пад паўднёваю зоркай,
І сонца, і ў кветках арык.
Дык што ж вы на шэрыя ўзгоркі
Сумны рассыпалі крык?
1957

## ЛІПЕНЬ

Можа ніцма ўпадзеш ты ў густую траву —
Паслухай,
Мо' да дрэва прытуліга на міг галаву —
Паслухай,
Мо' на хвалі азёрнай ты ляжаш спіной —
Паслухай,
Можа ноччу ісці будзеш цёплай раллёй —
Паслухай!
Ты пачуеш:
карэнні п'юць вільгаць
з нябачных крыніц,
Ты пачуеш,
як кожны лісточак на дрэве
звініць,
Ты пачуеш,
як пчолы снуюць і снуюць
у паўдня,
Ты пачуеш,
якая над светам стаіць ціпылш!
1957

* * *

Павуціны беленькая нітка
На пінжак мне села. Я здымаю
І кладу яе на крылы ветру:
Хай ляціць па нівах, сёлах...
Восень.
Ля варот — чырвонай бульбы горка.
Паўз яе нясуць бульбоўнік дзеці,
І жанкі духмяныя ахапкі
Рэжуць на сячкарні новай...
Восень.
Я іду сялом. На светлых стрэхах
Паласатыя бакі ўграваюць
Гарбузы. За шыбай — памідоры,
Нібы жар, палаюць ярка...
Восень.
Шлях вядзе ў палі. Здаля йасустрач
Пылу коціцца клубок. Ды гэта ж
Наш шафёр вязе капусту з градаў -
Кузаў качаноў бялюткіх...
Восень.
Ліст тапчу я. Цёпла — на прылеску.
Я кладуся на сівец, пад сонца,
Што ўжо нейкім дарагім да болю
Стала сёння...
1958

* * *

Холадам дыхнула з-за вугла,
І ў лугах адзін гуляе вецер:
Страсяне ракіт тугое вецце,
Кінецца, шалёны, да сяла.

Яблык у садку крылом саб'е,
Уварвецца з лёту ў жаўталісце,
І ўжо клён, не ведаючы выйсця,
Проста валасы рве на сабе!
1957

* * *

Нават дзень, скажы, пражыць мне як
Рукі склаўшы, калі знаю я:
Кінеш зерне — колас зазвініць,
Слова знойдзеш — песня узляціць,
Пакладзеш цагліны ў мур радком —
Блісне дом на сонцы вокан шклом,
Яблынькі насадзіш рад у рад —
Па вясне сыпне пялёсткі сад.
А растопіш лёд, сагрэе дол —
Заквітнее ўся зямля наўкол!
1957

## ІДЗЕ ПАЛЯМІ АГРАНОМ

На светлай руні за сялом
Дыміцца ледзь раса.
Ідзе палямі аграном —
Шаўковая каса.

Ідзе палямі аграном.
Прыцішыць крок ля град,
Над дружным схіліцца ільном,
Агледзіць роены сад,

Праверыць кожны клін кругом,
Мне пасміхнецца ўслед...
Ідзе палямі аграном —
І харашэе свет!
1958

## ЭКСКАВАТАР

Густым туманам сіняватым
Наўсцяш услань балаты.
На багну вышаў экскаватар,
Адразу змяўшы чараты.

І вось ён дол за чуб травяны
Рукою мерыцца узяць:
Палескі ціхі край тумайаў
Да сонца вырашыў падняць.
1954

## ГРЭЧКА

Не пралез бы нават вуж у грэчцы,
Белая — цвіце яна.
Здаецца,
Нібы снег тут выпаў сярод лета,
Аблажыўшы гурбамі палетак.
А мо' гэта й ссцъ той снег, што дружна
Затрымалі мы з табою ў сцюжы?
1955

* * *

У цемру вячэрняга неба
Прысады ўзнімаюць гаплё.
Шлях млечны, мінаючы вербы,
Над вуліцай ціхаю лёг.

А хлопец з усмешкаю яснай
Рубільнік у ГЭС павярнуў,
І вось па-над вёскай калгаснай,
Бы рой, у хвіліну адну,

Наўкол асвятліўшы пагоркі
І люстра шырокай ракі,
Ўзляцелі калгасныя зоркі
У хлопца з-пад дужай рукі.
1955

**У КУЗНІ**

За шклом акна ў далечыні
Вятры ўздымаюць снег,
Ты дзверы ледзь прыадчыні,
І сцюжа ў твар дыхне.

А ў кузні з горна, што гудзе
І ў полымі штодня,
Нібы ад сонца ў ясны дзень,—
Шугае цеплыня.

Патрэбны сеялкам вінты
І зубы — для барон.
Куе каваль, і малаты
Ўздымаюць гром і звон.

Ён і не думае гуляць.
Пот раўчуком з ілба.
Распачалася ў каваля
Вясновая сяўба!
1955

* * *

Не праміне ніхто карціны,
Што ў клубе зіхаціць пад шклом.
Яе ў натхнёную часіну
Пісаў пастух наш за сялом:
Ліства ў садах укрыла густа
Зарой налітыя плады,
І светлы дом, што на лугу стаў,
Злучае з сонцам правады.
Адбіта ўсё, што сэрцу міла,—
Прастор і золата жытоў,
І нават песня, што застыла
З адкрытых вуснах юнакоў.
1953

**ВЯСНА**

Гракі вясну прынеслі зноў на крылах,
Рассыпаўшыся дружна на палі.
І далі сіняя смуга укрыла,
І раўчукі ў канавах загулі.

Лістоты дым зялёны спавівае
Бярозак стройных малады лясок.
Шурпаты клён ля шляху вылівае
З латка ў збанок гаючы свежы сок.

Ралля дыміцца цёплая паволі,
Шумяць галлём прысады ля дарог.
А неўгамонны жаўранак над полем
Склікае трактарыстаў на разлог.
1953

## *П е р ш а е   к а х а н н е*

### ПЕРШАЕ КАХАННЕ

Я з кніжкамі бегаў у школу штодня,
Аб дальніх краях, аб Даватары сніў,
Па вуліцы, босы, я мячык ганяў,
Гарцаў без сядла на кані.

І так не згадаў, як аднойчы вясной,
Ледзь толькі за хатай садок пацямнеў,
У кофтачцы белай, з чарнявай касой
Прышло яно ў сэрца ка мне.

І з гэтай пары ні хвіліны нідзе
Ніяк я на месцы уседзець не мог:
Хадзіў, бы падхоплены ветрам, штодзень,
І мала было мне дарог.

Я прагна глядзеў і глядзеў на расу,
У хмаркі ўзіраўся, спыняючы крок,
У кожны лісточак, а бачыў паўсюль
Адны толькі ямачкі шчок...

Прайшлі тыя дні, вір пачуццяў прыціх:
Другі я цяпер, і здаецца парой,
Як быццам бы гэта было не ў жыцці,
А чуў я у песні якой.
1957

### ЛОДАЧКІ

Хоць было мне і шкада,
Ды абула лодачкі.
Вышла з хаты — любата:
Аж рыпяць на сходачках.

Пэўна, гляне ўжо не так
На мяне Міхасік мой,
Калі ў клубе тупну ў такт
Тоненькім абцасікам.

А прышлося: і ў мой бок
Не глядзіць ніколечкі.
Бачу: вышаў у садок
З старшынёвай Волечкай...

Дайце ж круг і размах
Мне, малодачкі:
Няхай б'юцца ў пух і ў прах
Мае лодачкі!
1958

**СУСЕДКА**

Ноч, а я не сплю. Дзе сон мой?
Зноў кручуся — сам не свой.
І чаму падушка сёння
Стала мулкаю такой?

З панадворку ў раму ветла
Голлем грукае вясна,
На падлозе месяц светлы
Распластаўся ля акна.

І харошай ноччу гэткай
За сцяною — знаю я —
Недзе блізка спіць суседка
Інтэрнацкая мая.

Пра адну яе ў пакоі
Цэлым гуртам за сталом —
Што ні вечар — між сабою
Мы дыскусію вядзём.

Перапынкамі пры стрэчы
Бачу: быццам незнарок,
Мусіць, сто вачэй хлапечых
Накіраваны ў той бок.

І між іх — мае таксама:
Як тут сэрцу рады даць?
Хоць на вочы ёй часамі
Я імкнуся пападаць.

А яна мо' раз і гляне:
Як і ўсе, хлапец, маўляў. а»
Ці ж ёй знаць, нашто ўсё ранне
Я чупрыну папраўляў.

А прыйшоў дадому ўвечар —
Паглядзеў: ізноў яна!
З аднакурснікам аб нечым,
Чую, шэпча ля акна.

Не заснуць ніяк. Дзе сон мой?
Зноў кручуся — сам не свой.
І чаму падушка сёння
Стала мулкаю такой?
1955

* * *

Табе, сяброўка, ехаць на вакацыі,
І добра мне яшчэ прайсці з табой,
Ды свісток прарэзлівы на станцыі
І вокны паплылі перада мной.

Лаўлю я гюзіркам вагоны цёмныя,
ІЛто ўжо ляцяць у срэбраную ноч,
І да драбніц гарэзны твар успомню я
І цеплыню такіх ласкавых воч.

Удаль пабеглі шпалы пад парошаю.
Ты недзе, аглядаючы праецяг,
Стаіш, напэўна, ля акна, харошая,
Цярэбячы свой шалік на грудзях.

Між хвоек дым апошні расплываецца,
І рэйкі ўздрыгваюць усё цішэй...
Ды гэта толькі поезд аддаляецца,
А ты мне робішся яшчэ бліжэй!
1957

**ЛІВЕНЬ**

Дзень па чэрвеньскіх травах
Мы з табою блукалі,
Не заўважылі нават,
Як захмарыла далеч.

Раптам лівень — як хлыне!
А наўкол — хоць бы дрэўца.
Я — у тэнісцы сіняй,
Ты — у лёгкай сукенцы.

За хвіліну якую
Ты прадрогла б, няйначай,
Прытуліў, дарагую,
Да грудзей да юначых.

Ты ўсміхнулася, бачу...
Скрозь шумела трава ўся...
І стук сэрцаў гарачых
З веснім громам зліваўся!
1954

## САЛАЎІ

Анямееш проста каля тына,
Калі трэлі ўдарацць ад гаёў.
Марыў часта я тады з дзяўчынай
Удваіх паслухаць салаўёў.

З-за яе, вяснупічатай гарэзы,
Страціў сон я, страціў я спакой.
А заўчора ўвечар каля бэзу
Мы — рука ў руку — стаялі з ёй.

Аж да дня аб шчасці размаўлялі,
Чуўся стукат сэрцаў маладых.
Салаўі тады ўсю ноч спявалі,
Ну, а мы і не пачулі іх!
1954

* * *

Мусіць, хлопцу ліпы нечым
Спадабаліся мае:
Прыдзе, сядзо — што ні вечар,
У руках баян пяе.

Паўз яго знарок прайду я
Ды зірну — вясёла так,
Позірк ён убок скіруе,
А баян губляе такт.

— Колькі будзеш,— я смяюся,—
Пад акном рыпець маім? —
Ды пакрыўдзіўся ён, мусіць:
Перастаў іграць зусім.

Стрэла раз: — З якой прычыны
Ты пра свой баян забыў?
Усміхаецца хлапчына:
— Планку недзе я згубіў.

Усмешка ясная такая,
А ля рэчкі — салаўі...
— Што ж,— кажу я,— пашукаем,
Пэўна, знойдзем удваіх.
1954

**АГРЭХІ**

Чуцен гул матора ў наваколлі—
Ходзіць трактар каля вёскі ў полі.
Чуб бялявы ўсім відаць з кабіны —
Не зпімае рук з руля хлапчына.
Рэжа лемяхамі дол, ды й годзе,
З баразён вачэй сваіх не зводзіць...
— Добра ты арэш,— скажу я,— хлопча,
Толькі ўсё ж узняў бы ты хоць вочы.
Ты пе бачыш: ідучы з работы,
Дзе арэпі ты, мокры ўвесь ад поту,
На цябе крадком, праз хмары пылу,
На грудзях касу паклаўшы міла,
Нешта пазірае штохвіліны
Слаўная чарнявая дзяўчына.
Ну, а ты арэш сваім парадкам,
Думаеш: ідзе ў цябе ўсё гладка,
Толькі ж я скажу табс без смеху:
У цябе — вялікія агрэхі!
1955

* * *

Цалавала, радавала
Пад густымі вішнямі
І маўчаць загадвала
Там, дзе словы лішнія.

Ты ў каханні, ззяючая,
Ласкай не скупілася;
Шчасце не здрабняючы,
Мне сябе дарыла ўсю.

Ды пакрыўдзіў, любую,
І — напэўна, лёс такі —
Развяло да шлюбу нас
На вакзале лёскатам.

А гады бягуць усё
Паўз цябе, далёкую...
Знаю: ты занудзішся
Недзе, адзінокая,

Я ж да дня вяснянымі
Зноў хаджу сцяжынамі.
Без цябе жыцця няма,
Родная, адзіная!
1958

* * *

Ідзе яна, і ветрык ёй з зарэчча
Цалуе шчокі, яркія, як мак.
Зірнепт — такія вузенькія плечы
І шчупленькая гэткая сама,

Што ты, праходзячы па сцежцы міма,
З-за каласоў, устаўшых як сцяна,
Яе і не прыкмеціііті тут, магчыма.
А мне ж яна з усіх дарог відна!

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

## ЗМЕСТ

Такія сэрцы ў нас

**КАЗАХСТАНСКІ ЖНІВЕНЬ**
Юнацтва ў дарозе
Праязджаючы Урал
Палатка
Экзамены
Золата Джэтыгары
Рукі
Як гартавалася сталь
Тарпан
Двое ў стэне
У гасцях у казаха
Хлеб
Наша маладосць

**РЭХА**
*** Іду зямлёй я, сонцу рад...
Раніца
Веска мая
Вясна ў Дуброве
Хлапчукі
У музеі Янкі Купалы
Мяцеліца
*** Вецер гойсае
Лесавы хмель
Журавы
Ліпень
*** Павуціны беленькая нітка...
*** Холадам дыхнула
*** Нават дзень
Ідзе палямі аграном

Экскаватар
Грэчка
*** У цемру вячэрняга неба…
У кузні
*** Не праміне ніхто
Вясна

**ПЕРШАЕ КАХАННЕ**

Першае каханне
Лодачкі
Суседка
*** Табе, сяброўка, ехаць…
Лівень
Салаўі
*** Мусіць хлопцу…
Агрэхі
*** Цалавала, радавала…
*** Ідзе яна